**В. С. Забродская**

## МОЦ І РЫСЫ ПАЭТЫЧНАГА ХАРАКТАРУ А. ПЫСІНА

Творы Аляксея Васільевіча Пысіна і сёння кранаюць душы чытачоў, бо яны наскрозь прасякнутыя гуманізмам і прадстаўляюць свет высокай чалавечнасці асобы, якая, прайшоўшы вайну, здолела праз прызму ўласнага вопыту ў паэтычных вобразах прадставіць духоўны і маральны кантэкст жыцця.

Напрыклад, амаль у кожным творы А. В. Пысіна мы знаходзім развіццё думкі пра тое, што вечнасць – гэта вельмі трывалая сувязь часоў (мінулага, сучаснасці, будучыні). Часам нават узнікае ўражанне, што лірычны герой лічыць менавіта сябе адказным за тое, што і як адбываецца ў сусвеце. Прыгадаем, напрыклад такі радок А. В. Пысіна: *Усё маё і ўсё са мной*. (Дарэчы, у Ф. І. Цютчава мы знаходзім: “Всё во мне, и я во всём”.) У прыведзеных радках падобная нават рытміка-інтанацыйная структура. Але герой Ф. І. Цютчава і сам становіцца неад’емнай часткай сусвету, а таксама ў сабе бачыць цэлы свет. У творы ж А. В. Пысіна ўвага сканцэнтравана на тым, што чалавек – гэта звяно ў ланцугу вечнасці, менавіта ён нясе адказнасць за гармонію ў свеце, усімі сіламі імкнучыся да дасканаласці, пры гэтым удасканальваючы не толькі сябе, але і спрабуючы зрабіць свет лепшым, чысцейшым, а ў рэзультаце гарманічным.

Свой светапогляд паэт ўдала прадстаўляў у вершах, якія прызначаліся як для малых дзяцей, так і для дарослых. Кожным сваім радком творца

нагадвае чытачу пра неабходнасць спасціжэння загадак сусвету, а таксама чалавечага характару і існасці дзеля захавання гармоніі і цэласнасці сусвету. Прыгадаем наступныя радкі паэта:

З чаго чалавек пачынаецца?
У калысцы ён калыхаецца.
А пакідае калыску, –
Бярэцца за лыжку і міску.
Добра трымаючы лыжку,
Глядзець пачынае ў кніжку.
Што яшчэ возьмеце ў свеце, –
Скажаце, як падрасцеце.

Безумоўна, цяжка рабіць канкрэтныя прагнозы на самым пачатку жыцця чалавека, складана прадбачыць, з чаго будзе складацца яго характар. У павучальных вершах праз замалёўкі будзённага жыцця, насычаныя дакладнымі дэталямі, А. В. Пысін апісвае асаблівасці ўзросту і характару малых:

Дзяўчынка зусім малая,
Словы не ўсе вымаўляе.
Усё яна разумее,
Толькі сказаць не ўмее.
А трэба ж захапляцца,
Радавацца і смяяцца,
Нешта рабіць, забаўляцца
І да старэйшых звяртацца.
Ёсць ў дзяўчынкі мова,
Знаходзіцца і слова.

Лаканізм і сцісласць, уласцівыя праграмным верашам А. В. Пысіна, дапамагаюць прадставіць аб’екты нежывой прыроды праваднікамі памяці і натхнення. Дзеля гэтага яны надзяляюцца душой, персаніфікуюцца:

Прырода – скульптар.
Вечна лепіць,
Не даспадобы, ўсё не так,
Пад ногі кіне, зноў замесіць
І возьме месіва ў кулак.
Даўно пад ёю бесканечнасць,
Але шэдэўраў тых –
Няма.
І часам гэткае скамечыць,
Што потым журыцца сама.

Звяртаючыся ў сваёй творчасці як да мінулага (*Я сваё мінулае гартаю…*), так і зазіраючы ў будучыню (*Не хацеў бы нічым я запляміць // Вас, патомкі, у якіх ажыву*), паэт прадстаўляў жыццесцвярджальную і жыццядайную энергію прыгажосці і хараства. Нездарма яго паплечнік і сябар – В. І. Арцем’еў ахарактарызаваў творчасць А. В. Пысіна наступнымі словамі: “Яго мастакоўскае крэда: уменне разумець праявы свету і сусвету… браць прыроду ў суаўтары і весці філалагічны і філасофскі дыялог з вечнасцю пра жыццё свайго народа… Дабрыня і спагадлівасць былі яго сутнасцю – яны стрыжань пысінскай паэзіі, якая выпраменьвае людзям сучаснае і вечнае”.